**А. В. Семянькевіч**

# СІНТАГМАТЫКА ЗЛІЧАЛЬНЫХ МНОЖНАЛІКАВЫХ НАЗОЎНІКАЎ

Адным з крытэрыяў вылучэння канкрэтна-прадметных намінацый у асобны клас субстантыўнай лексікі з’яўляецца іх магчымасць спалучацца з колькаснымі словамі. У традыцыйнай граматыцы лічыцца, што большасць злічальных назоўнікаў мае поўную парадыгму ліку. Але ў беларускай мове ёсць шэраг назоўнікаў, якія паддаюцца злічэнню, аднак маюць толькі форму множнага ліку. Па нашых падліках, яны складаюць каля 20 % ад агульнай

колькасці назоўнікаў pluralia tantum (далей plt). Гэтая лічба сведчыць пра тое, што гэта не анамальная з'ява, рэпрэзентантаў якой можна было б аднесці да маргінальнай зоны выключэнняў з правіла, а пэўная граматычная заканамернасць.

Злічальныя плюратывы выяўляюць спецыфіку ў адносінах як да незлічальных plt, так і да карэлятыўных злічальных назоўнікаў. У адрозненне ад незлічальных plt, назоўнікі тыпу *сані, нажніцы* маюць марфалагічна няпоўную, але ф у н к ц ы я н а л ь н а поўную лікавую парадыгму, бо ў адных кантэкстах могуць абазначаць грамемы адзіночнага ліку (*Хлопец на хаду ўскочыў у сані. Дай мне сінія нажніцы. Дзіця надзела штаны*), а ў іншых – грамемы множнага ліку (*Па дарозе ехала чарада саней. Нам спатрэбяцца нажніцы рознага памеру. Яму кароткія ўсе яго штаны*). У гэтай супярэчнасці лінгвісты бачылі праяўленне аманіміі лікавых форм (А. А. Залізняк, Г. К. Паліванава) або граматычнай мутацыі (Л. Г. Яцкевіч). Некаторыя мовазнаўцы (Г. М. Сямёнава) уласцівасць плюратываў выражаць значэнні адзіночнасці і множнасці аднолькавымі формамі з дапамогай розных кантэкстаў адносяць да з'явы марфалагічнага аналітызму ці лексічнай субстытуцыі, пры якой флектыўная недастатковасць кампенсуецца спалучэннямі з лексемамі, ідэнтычнымі па семантыцы граматычным формам (А. А. Калеснікаў).

Як і ўсе злічальныя карэлятыўныя назоўнікі, злічальныя множналікавыя назоўнікі спалучаюцца з:

– лічэбнікамі і словам *некалькі*: *двое нажніц, некалькі нажніц*;

– квантарамі *штука, пара* і інш.: *пара нажніц*;

– квантыфікатарамі *кожны* і ўсе: *кожны вучань меў нажніцы, нажніцы ляжалі на кожнай парце, усе нажніцы завостраныя*;

– дзеясловамі дыстрыбутыўна-сумарнага спосабу дзеяння: *выдаць усім па нажніцах, вучні пакідалі нажніцы*;

– прыназоўнікам *па* + месны склон множнага ліку ў дыстрыбутыўным значэнні: *купіць усім па нажніцах*;

– прыназоўнікам *з* + творны склон множнага ліку: *не чапайце нажніцы з дэфектамі*;

– формамі множнага ліку сінтаксічна звязаных слоў: *узяўшы нажніцы, дзеці пачалі працу; цэннікі на нажніцах былі пераблытаныя; нажніцы вучняў былі невялікія.*

Аднак злічальныя плюратывы маюць і істотныя сінтагматычныя адрозненні ад карэлятыўных назоўнікаў. Назоўнікі тыпу *сані, нажніцы* з'яўляюцца адзінай групай слоў, якія могуць спалучацца толькі са зборнымі лічэбнікамі *двое, трое, чацвёра*, хаця гэтыя спалучэнні і маюць лакуны – адсутнічаюць адпаведныя састаўныя лічэбнікі (такая колькасць перадаецца апісальнымі канструкцыямі). Са зборнымі лічэбнікамі, пачынаючы з *пяцёра*, сувязь злічальных plt адрозніваецца толькі магчымасцю іх паралельнага ўтварэння з колькаснымі лічэбнікамі ў назоўным склоне (*пяцёра саней – пяць саней*). Акрамя таго, злічальныя plt выяўляюць спецыфіку ў спалучэнні са словамі *адны* і *кожныя*. Слова *адны* можа рэалізваць функцыю колькаснага

лічэбніка толькі з множналікавымі назоўнікамі (*адны сані*, але нельга *адны сталы* ў колькасным значэнні). Квантыфікатар *кожныя* (у форме множнага ліку для абазначэння граммемы адзіночнага ліку) таксама можа спалучацца толькі з плюратывамі (*кожныя суткі*, але нельга *кожныя сталы*).

Пералічаныя сінтагматычныя характарыстыкі сведчаць пра тое, што ў беларускай мове выпрацаваны граматычныя механізмы маркіроўкі множналікавых назоўнікаў. Гэта аказваецца вельмі важным у вырашэнні праблемы аб'ёму паняцця plt. Пры вызначэнні граматычнага статусу полісемантычнага назоўніка, які мае форму адзіночнага ліку, мэтазгодна абапірацца не на ступень яе узуальнай ужывальнасці, а на семантычныя суадносіны лікавых форм па ўсім складзе семнай структуры лексемы. Пры такім падыходзе лексічная зона канкрэтных plt значна пашырыцца за кошт назоўнікаў з множналікавай семай 'пара' і 'набор'. Напрыклад, назвы абутку ў традыцыйнай граматыцы не адносяцца да зоны плюратываў, аднак у практыцы марфалагічных апісанняў іх нярэдка разглядаюць сярод іх. Такія супярэчнасці ў кваліфікацыі назваў абутку выкліканы наяўнасцю ў іх семантычнай лікавай парадыгме трох значэнняў формы множнага ліку: 1) *боты* 'асобныя боты, узятыя не ў пары' – карэлятыўная сема; 2) *боты* 'пара, від абутку' plt; 3) *боты* 'некалькі пар' plt. Множналікавыя семы дыягнастуюцца дыстрыбутыўнымі кантэкстамі, уласцівымі злічальным plt. Лічэбнік *адны* ў колькасным значэнні спалучаецца толькі з плюральнай формай у значэнні 'пара' (*Маю на зіму адны боты*). Зборныя лічэбнікі *двое, трое, чацвёра* таксама ўжываюцца толькі з такой формай (*Двое ботаў аднаго памеру*), тады як з формай множнага ліку ў значэнні 'адзінкавыя прадметы' спалучаюцца колькасныя лічэбнікі (*два левыя боты*). Плюральна-парную сінтактыку выяўляюць назвы абутку і ў спалучэнні з квантарам *кожныя* (*На кожных ботах зламана маланка*, але нельга *кожныя левыя боты*), а таксама ў дыстрыбутыўных канструкцыях (*Куплю ўсім па ботах*). Калі быць паслядоўнымі і з'яву plt разглядаць на ўзроўні асобных лексіка-семантычных варыянтаў, назвы пар варта адносіць да зоны плюратываў.

Такім чынам, сінтагматычныя прыметы канкрэтна-прадметных злічальных назоўнікаў з'яўляюцца фармальным моўным інструментам семнай дыферэнцыяцыі і таму павінны ўлічвацца пры іх лексікаграфічным апісанні. Пабудова дыягнастычных дыстрыбутыўных кантэкстаў дазваляе вылучыць множналікавыя семы ў семантычнай структуры канкрэтных назоўнікаў.